А. С. Сакалоўская

# КАЛЬВАРЫЯ



А. С. Сакалоўская

# КАЛЬВАРЫЯ

Навуковы рэдактар
пробашч Касцёла
Святых Сымона і Алены
ксёндз–магістр
Уладыслаў Завальнюк

Мінск

1997

## ЗМЕСТ


1. Ці можа быць будучыня без ацэнкі мінулага? 3
2. Замест уступу 6
3. Што захавала памяць 10
4. Мой Род 24
5. Тут знайшлі свой спачын 29





Касцёл Св. Сымона і Св. Алены

ЛІЦЭНЗІЯ № 493



© А.Сакалоўская, 1997

# ЦІ МОЖА БЫЦЬ БУДУЧЫНЯ БЕЗ АЦЭНКІ МІНУЛАГА?

*Не тое вечнае, што бачым,*
*а тое, што ў духу і веры аглядаем.*

На небе безліч зорак, але яшчэ больш іх, нябесных сонцаў, сабрана на Вечным нябесным шляху. Не раз гэтыя зорачкі нагадваюць нам пра штосьці таямнічае, вечнае. Тады міжволі задумваешся пра сваё далейшае жыццё, пра сваё месца ў вечнасці, пра апошні спачын, і думкі самі па сабе спыняюцца на могілках, якіх так многа на тэрыторыі Беларусі, спачываюць на іх людзі добрыя і славутыя. Кожныя могілкі – гэта своеасаблівая таямніца, Кальварыйскія – таксама. Не адно пакаленьне бацькоў і дзядоў, якія адышлі ў вечнасць, сабрана тут, кожнае з іх нагадвае пра сябе асаблівым спосабам.

Могілкі для веруючага чалавека–хрысціяніна – гэта не месца плачу і смутку, а спадзяванне на жыццё вечнае з Уваскрослым Езусам Хрыстом, надзея на вечную ўзнагароду за разумна і сумленна пражытае жыццё, за добрыя ўчынкі, за веру, за любоў да Бога і бліжняга.

Могілкі – месца ўспаміну, разважання, малітвы і ўдзячнасці ўсім, хто там спачывае.

Могілкі – гэта гісторыя твайго народа, прыклад, памяць, твой гонар.

Могілкі – гэта бачныя карані дрэва таго ці іншага народа, пакалення. Як мы, людзі, пільнуем, даглядаем, адносімся да каранёў свайго дрэва, такім яно і будзе. У якой пашане і памяці памерлыя, такія жыццё і лёс нашчадкаў: калі няма пашаны да памерлых, тады пустая будучыня, без нацыі, культуры, духоўнасці. У гэтых адносінах для веруючых і няверуючых прыкладам з'яўляецца хрысціянства. У кожнай нашай святыні служацца набажэнствы за памерлых не толькі на Дзяды (2 лістапада), але амаль штодзённа. Гэта малітоўная памяць з боку жывых не толькі для памерлых, але і для напаміну тым, хто застаўся, адкуль яны паходзяць, дзе жывуць, каб не забываліся сваю радню, сваё прозвішча, не цураліся сваёй краіны, захоўвалі свае духоўныя карані, герб сямейства, які існаваў у старажытнасці, – адным словам, прыналежнасць да вялікага народа не толькі сваёй асобаю, але і радаводам, з якога паходзім. Дзякуючы гэтым караням, гэтай спадчыне мы, як маладыя парасткі, бяром пачатак, жывём, а пасля нас эстафету жыцця будуць несці нашыя нашчадкі.

Могілкі кожны раз сустракаюць нас сваёй маўклівасцю і цішынёй. Праходзіш, чытаючы надпісы на помніках простых ці вядомых людзей, – чытаеш сваю гісторыю, як у люстэрку бачыш сябе. Жыццё гэтых людзей было такое кароткае, як адно імгненне ў параўнанні з вечнасцю, нават карацейшае за гэты злучок 1839–1905, які аддзяляе дату нараджэння ад даты смерці. А.Д. — Анно Доміні — году Панскага. У гэтай рысачцы, якая стаіць паміж нараджэннем і смерцю чалавека, закадавана ўсё яго жыцьцё, гэта знак, за якім стаяць усе жыццёвыя справы, думкі, воля чалавека, вядомыя толькі Богу. І ключом да гэтага ёсць толькі крыж Хрыста Збаўцы, Які праз Ахвяру на крыжы даў чалавеку шанец збавення. Ён прынёс нам духоўную дапамогу, паратунак, навуку, каб нас не ашукаў злы дух сваімі спакусамі, а нашы душы знайшлі ў сабе моц барацьбы з ім, таму што многія за сваё жыццё так і не адкрыліся Богу праз Сакрамант Хросту, Споведзі, малітву і веру. Чым большую чалавек мае веру ў сэрцы, тым больш ён любіць сваю Айчыну, свой народ, культуру, духоўную спадчыну, шануе і памятае пра тых, якія адышлі да вечнасці. Чалавек атрымлівае і развівае культурную спадчыну, бо дух аб'ядноўвае, дух заўсёды жывы, і гэтыя людзі, якія прамаўляюць да нас з помнікаў і таблічак, жывуць у сваім народзе, у сваіх нашчадках. Яны жывуць перад Богам, моляць Усявышняга, просяць Божай Міласэрнасці для цябе і мяне, для ўсіх нас. Для разумення Бога, вечнасці нам дадзена вера, гэта яна нас ажыўляе і аб'ядноўвае, ачышчае нас, ставіць мэты, да якіх мы імкнемся і такім чынам усведамляем свой абавязак перад Богам і людзьмі.

Ці можа быць будучыня без ацэнкі мінулага? Не хачу нікога абразіць, хачу выказаць сваю думку. Вельмі многа ў нашай краіне навукоўцаў, пісьменнікаў, інтэлігенцыі, працаўнікоў асветы, культуры, медыцыны прыкладваюць шмат намаганняў, прысвячаюць усё сваё жыццё, уносяць свой непасрэдны ўклад у адраджэнне сваёй краіны на шляху да лепшай будучыні народа, але амаль усе іх дзеяньні накіраваны толькі ў матэрыяльны бок, для дабрабыту матэрыяльнага. А як мала робіцца ў накірунку духоўнага і хрысціянскага адраджэння. Людзі, якія працуюць на ніве аднаўлення спадчыны, не супраць духоўнага адраджэння, але што можа даць чалавек, які не навучаны з дзяцінства пераступаць парог храма, які не можа пераадолець сябе і цяпер. Да сённяшняга дня ўсё духоўнае аднаўленне ўскладзена на плечы святароў і бацькоў. Мы павінны быць падобнымі да нашых прадзедаў і бацькоў не толькі з твару ці мець аднолькавае прозвішча,

але захаваць культуру духа, мову, любоў да Бога і Айчыны, жывую веру, наведваць храмы, быць не толькі ахрышчанымі, але прыняць Сакрамант Шлюбу, спавядацца, маліцца, смела прызнавацца, што верым у Бога, гаварыць іншым, асабліва маладым, пра Бога і хрысціянства. Як сьвятло маяка імпульсамі паказвае накірунак караблям, каб не заблудзілі і не загінулі ў адкрытым моры, так і нашыя продкі сваім жыццём і прыкладам з'яўляюцца для нас духоўным імпульсам, паказваюць нам накірунак у жыцці і веры. Нашае пакаленне павінна быць ім удзячнае, памятаць і з усёй адказнасцю,як належыць адукаваным людзям XX стагоддзя, сумленна адносіцца да жыцця, духоўнасці і культуры сваёй і свайго народа.

І на заканчэнне няхай кожны з нас задасць сабе пытанне: а куды мы паказваем накірунак, які прыклад даем сваім нашчадкам, які след пакідаем пасля сябе, што скажуць пра нас нашы наступныя пакаленні?

Кальварыя – адны са старажытных могілак Беларусі. Абавязак уладаў, жыхароў Мінска захаваць іх, прывесці ў парадак.

Пробашч касцёла Св. Сымона і Св. Алёны
ксёндз–магістр Уладыслаў Завальнюк

*Майму Роду прысвячаецца*

## ЗАМЕСТ УСТУПУ

**На магілках не сеюць пшаніцы,**
**з чужой крыўды не вырасце доля.**
**Хто не здольны прад здзекам спыніцца –**
**панаваць той не будзе ніколі.**

*Ларыса Геніюш.*

Пра маральнасць людзей можна меркаваць па іх адносінах да памерлых. А стан могілак у той ці іншай ступені вызначае і стан грамадства.

Надпісы на помніках, крыжах расказваюць не толькі аб тых, хто пад імі ляжыць. Ходзіш па могілках на Беларусі і адразу бачыш, ад якога суседа, заходняга ці ўсходняга, залежала наша зямля, на якой мове маліліся і моляцца людзі. Збітыя, паламаныя крыжы, паваленыя помнікі – таксама сведкі пэўнага перыяду жыцця нашага грамадства, які пачаўся амаль восемдзесят гадоў таму і, на жаль, працягваецца яшчэ і цяпер.

Могілкі патрэбныя не столькі мёртвым, колькі жывым. Надгробкі нагадваюць, што ты не вечны, што на зямлі ты толькі госць, што тут твае карані. А таму, каб не парвалася повязь часу, ты не маеш права забываць пра іх.

Большая частка маіх родных пахавана на Кальварыі – старадаўніх могілках Мінска. Я памятаю Кальварыю столькі, колькі памятаю сябе. Мяне і ў дзяцінстве не аберагалі ад перажыванняў, якія звязаны са стратай блізкіх людзей. Я разам з дарослымі па–свойму, па–дзіцячы, перажывала гора. Тут пахаваны мае прадзеды, дзяды, бацька. Некалькі разоў на год я прыходзіла і прыходжу на Кальварыю, каб прыбраць магілы, успомніць, паразважаць, папрасіць дапамогі, памаліцца за душы памерлых.

За 50 гадоў, якія прайшлі з дня смерці майго бацькі ў 1945 годзе, стан могілак змяніўся. Раней гэта былі толькі каталіцкія могілкі, усе надпісы на крыжах, помніках былі на польскай мове. Пасля вайны канфесійная прыналежнасць памерлага не ўлічвалася, тут хавалі ўсіх. У выніку мяняецца "моўная сітуацыя": надпісы на пасляваенных

пахаваннях – і каталікаў і іншых – амаль усе на расейскай мове (як і на ўсіх сучасных могілках). Усё гэта яркае пацвярджэнне таго, "хто ў нашай хаце гаспадар".

Разбураюцца старадаўнія помнікі. Іх разбурае не час, а людзі, калі можна так назваць вандалаў. Было некалькі хваляў разбурэння. У 20–30-я гады нашага стагоддзя руйнавалі фамільныя пахавальні. Забралі ўсё, што можна было забраць, апаганілі,ператварылі ў прыбіральні.

У 60–70-я гады збівалі крыжы з помнікаў, выварочвалі помнікі. У 80-я гады шукалі золата – раскопвалі магілы. У 90-я гады адбылося некалькі актаў вандалізму, апошні ў 1995 г. у ноч на Дзяды, калі было разбурана каля 50 помнікаў як сучасных, так і старадаўніх.

Усё гэта адбывалася і адбываецца на адпаведным сацыяльным і палітычным фоне, у рамках таталітарнага рэжыму. У 20–30-я гады ляцелі крыжы, купалы храмаў і галовы лепшых сыноў і дачок Бацькаўшчыны, галовы простых рабочых і непісьменных сялян. У 60–70-я гады руйнаваліся гарады (успомнім Мінск, Нямігу), зніклі апошнія нешматлікія беларускія школы ва ўсіх вялікіх і малых гарадах Беларусі. Цяпер ставяцца пад сумненне спрадвечныя гістарычныя сімвалы Беларусі, яе мова, яе незалежнасць. Усё гэта кожны раз развязвае рукі нелюдзям. І ідуць яны на могілкі, нішчаць, руйнуюць – мёртвыя ж не могуць сябе абараніць. Але гэта можам і павінны зрабіць мы, жывыя.

Гэтая кніга – сціплая спроба зберагчы тое, што пашкадаваў час, што яшчэ засталося, гэта частка нас, частка нашай культуры.

Праца над кнігай вялася на працягу пяці гадоў. Яна адрозніваецца ад ужо існуючых падобных прац (пра могілкі Роса ў Вільні, Лычакоўскія ў Львове, Паванзкоўскія ў Варшаве), у якіх гаворыцца толькі пра пахаванні знакамітых людзей.

У 1996 г.у Варшаве выйшла кніга Т. Чарняўскай і А. Ярашэвіча "Rzymsko–Katolicki cmętarz Kalwaryja w Mińsku na Białorusi" (І том серыі "Могілкі на даўніх Усходніх крэсах Рэчы Паспалітай), якая ўяўляе сабой рэестр надпісаў на помніках з указаннем памеру і матэрыялу помніка.

У прапануемай кнізе апісаны пахаванні, якія адносяцца да XIX і першай трэці XX ст. Аўтар лічыць, што ўсе пахаванні маюць каштоўнасць калі не сёння, то будуць мець у будучыні. Картатэка персаналіяў, на аснове якой складзеная гэтая своеасаблівая энцыклапедыя, налічвае 1995 адзінак. Яна стварылася ў выніку працы аўтара на Кальварыі і ў Дзяржаўным гістарычным архіве Рэспублікі

Беларусь. На працягу трох гадоў вялася праца непасрэдна на могілках. Апісваўся кожны помнік, на картку–пашпарт заносілася ўсё, што напісана на помніку. Кожная картка–пашпарт атрымлівала свой парадкавы нумар, які адпавядаў нумару пахавання на карце–схеме, што дадаецца да кнігі. Такіх картак менш, чым пахаванняў, бо помнік мог быць пастаўлены некалькім асобам. Усяго ў картатэцы зафіксавана 1417 такіх пахаванняў.

Пасля збору матэрыялу непасрэдна на могілках праца перайшла ў Дзяржаўны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь. Нас цікавілі Метрычныя кнігі мінскіх касцёлаў. У Метрычных кнігах вёўся агульны запіс пахаванняў на Кальварыйскіх могілках і на Залатой Горцы. Таму праводзілася выбарка пахаванняў на Кальварыі. У Метрычных кнігах запісы вяліся вельмі падрабязна: парадкавы нумар, прозвішча, імя, год, месяц, дзень смерці, колькі гадоў пражыў, месца і прычына смерці, сацыяльны статус, прафесія, каго пасля сябе пакінуў, указваюцца іх імёны, часта ўзрост. Да 1838–39 г.г. запісы вяліся па–польску, пасля па–расейску.

У Дзяржаўным гістарычным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваюцца наступныя Метрычныя кнігі касцёлаў.

| № | Гады | Фон | Воп | Адзінка захоўва |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Студзень 1836 — Снежань 1836 | 741 | 2 | 2 |
| 2 | Студзень 1837 — Студзень 1838 | 741 | 2 | 1 |
| 3 | 1838 — 1841 | 741 | 1 | 4 |
| 4 | 1849 — 1853 | 741 | 2 | 41 |
| 5 | 11 верасня 1853 — 30 верасня 1858 | 741 | 2 | 43 |

У выніку пошукаў у Архіве было знойдзена 96 запісаў аб пахаваннях, помнікі на якіх захаваліся. Акрамя таго, у энцыклапедыю ўключаны імёны некаторых людзей, якія пахаваныя на Кальварыі, але іх магілкі не захаваліся, запісы ж аб іх у Метрычных кнігах ёсць. Такіх 578 імёнаў.

Матэрыял падаецца ў выглядзе слоўнікавых артыкулаў. У слоўнікавым артыкуле указваецца: прозвішча, імя, у дужках –

прозвішча і імя на той мове і ў той арфаграфіі, як на помніку; або, калі захаваўся толькі запіс у Метрычнай кнізе, – на той мове, на якой зроблены там запіс. Затым указваецца нумар магілкі (напр., м. 105), інвентарны нумар у Метрычнай кнізе (напр., а. 58, калі гэты запіс ёсць). Ведаючы дату смерці і інвентарны нумар, можна лёгка знайсці запіс у Метрычнай кнізе пад адпаведным годам. Затым у слоўнікавым артыкуле падаецца ўся інфармацыя, якая ёсць на помніку, у архіве. Часам яна вельмі кароткая: надпісы на помніку могуць дрэнна чытацца, або помнік урос у зямлю, і чытаецца толькі частка надпісу. Калі ёсць разыходжанні паміж датай нараджэння і смерці, якая запісана на помніку і ў Метрычнай кнізе, то спачатку ўказваецца дата на помніку, а ў дужках – у Метрычнай кнізе.

Агульную лічбу асоб, пахаваных на Кальварыі, безумоўна, устанавіць немагчыма. За два стагоддзі існавання могілак час і людзі зрабілі сваё: сотні пахаванняў зніклі, дзесяткі яшчэ маюць нейкія адзнакі, але прачытаць надпісы на крыжах, помніках немагчыма: надпісы сцёртыя, помнікі ляжаць ніц або ўвайшлі ў зямлю, і, каб прачытаць, іх трэба падняць, раскапаць.

У рамках дадзенай кнігі не абышлося, безумоўна, без абмежаванняў, хоць вышэй сказана, што апісаны ўсе пахаванні, якія захаваліся з XIX і першай трэці XX стагоддзя. Апісваліся пахаванні з помнікамі, рэдка з крыжамі – як правіла, надпісы на крыжах доўга не захоўваюцца. Зрабіць татальны вопіс пахаванняў – пераўзыходзіць магчымасці аднаго чалавека. Мяркуем, што ў далейшым неабходна зрабіць наступнае: апублікаваць Метрычныя касцельныя кнігі з запісамі пахаванняў на Кальварыі і Залатой Горцы; зафіксаваць, апісаць і нанесці на карту–схему ўсе пахаванні, якія засталіся з XIX стагоддзя і да нашых дзён; прадоўжыць пошукі ў Архівах Метрычных касцельных кніг, запісаў у ЗАГСе, пошукі матэрыялаў аб пахаваных і іх нашчадках.

Аўтар дадзенай кнігі поўнасцю абмінуў архітэктуру помнікаў.

Праца павінна мець свой працяг. Спадзяюся, што яна знойдзе новых даследчыкаў і будзе спрыяць захаванню гістарычнай памяці.

Аўтар шчыра дзякуе пробашчу Чырвонага касцёла святых Сымона і Алены Уладзіславу Завальнюку за ягоную маральную і матэрыяльную дапамогу ў выданні гэтай кнігі. У зборы матэрыялу дапамагалі Марыя Апейка, Вольга Калацкая, Андрэй Рубцоў, за што аўтар ім вельмі ўдзячны.

*Ала Сакалоўская*
*25–га студзеня 1996 г.*
*г. Мінск*

## ШТО ЗАХАВАЛА ПАМЯЦЬ

"Цудоўным маёвым вечарам паехалі мы агледзець гэты арыстакратычны Мінскі могільнік, размешчаны ў паўночна–заходнім баку, за тры вярсты ад гарадскіх муроў.

Цяністая бярозавая алея рабіла мілейшы вечаровы халадок; выгляд буйной збажыны радаваў сэрца, і, расчуленыя, але не сумныя, ехалі мы пабачыць месца вечнага адпачынку. Спыніліся перад мураванаю брамаю, якая была чыімсьці надмагільным помнікам, заслоненым густымі дрэвамі, з–за якіх маляўніча выглядвалі таксама мураваныя помнікі..." Так апісвае Уладзіслаў Сыракомля сваё наведванне Кальварыі.[(1)]

Слова Кальварыя паходзіць з лацінскай мовы, Calvaria – Лысая гара (calva – чэрап), тое ж грэчаскае Галгофа ( якое з арамейск. gulgulta 'чэрап'). Так называлася гара пад Ерусалімам, на якой быў укрыжаваны Езус Хрыстус. Потым так пачалі называць капліцы альбо касцёлы, размешчаныя звычайна на пагоркавай мясцовасці, прысвечаныя культу пакутаў Езуса. У пераносным сэнсе слова Кальварыя абазначае пакуты, цярпенне, акалічнасці і месцы, звязаныя з імі.

У католікаў Беларусі, Літвы і Польшчы гэта было святое месца, куды сцякаліся натоўпы набожных, хворых, калек на пакаянне. Найстарэйшая Кальварыя была заснавана ў 1564 годзе ў Вільні.

Аб часе ўзнікнення Мінскай Кальварыі у літаратуры няма адзінай думкі. У «Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі, Мінск» [(2)] сцвярджаецца, што Кальварыйскія могілкі ўзніклі ў 18–м стагоддзі. У даведніку "Памятники Минска" [(3)] гаворыцца, што яны вядомыя з 1815 году. З тых пахаванняў, што захаваліся да сённяшняга дня на Кальварыі, самым старэйшым з'яўляеццца пахаванне *Юзэфы Амульскай*, якая памерла 12 чэрвеня 1808 г. Помнік з чырвонага граніту добра захаваўся. Тут жа ў 1824 г. была пахавана яе сястра *Тэафілія Амульская*.

Дык калі ж узнікла Кальварыя ? На гэтае пытанне аўтар знайшоў адказ у Дзяржаўным гістарычным архіве рэспублікі Беларусь.

---

(1) Ул. Сыракомля. Мінск. Беглы агляд сучаснага стану Мінска (пераклад з польскай) – Мн., 1992, с.24.

(2) Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі, Мінск. – Мн., 1988, с. 239.

(3) Памятники Минска. Составитель В.П.Шамов. Мн., 1991, с.73.

галавы Васіля Макаровіча ў Губернскае праўленне ад чэрвеня 1822 г. У гэтым прашэнні гаворыцца, што Кальварыйскія могілкі былі заснаваныя ў 1800 годзе на зямлі двараніна Васіля Макаровіча. Яго зямля была занятая пад могілкі, гарод, дом (багадзельню), дарогу яшчэ ў 1800 г., калі Васіль Макаровіч быў малалеткам. Межы могілак сцёртыя ў выніку таго, што яны ўвесь час пашыраліся і займалі сумежную зямлю, якая належала Васілю Макаровічу. Васіль Макаровіч просіць кампенсаваць грашыма за занятую яшчэ ў 1800 г. ягоную зямлю.

19–га верасня 1823 г. горад купіў у В.Макаровіча яшчэ 6056 кв. сажняў зямлі і дом пад багадзельню. Ён атрымаў у 1824 г. ад Гарадской Думы 5500 руб. У другім прашэнні Васіль Макаровіч скардзіцца, што яму не даплацілі грошы за 2764 сажні. Такім чынам, дакументы сведчаць, што Мінская Кальварыя была заснаваная ў 1800 годзе.

10–га жніўня 1832 г. духавенства звярнулася з просьбай аб дадатковым адвядзенні зямлі пад каталіцкія могілкі – Кальварыю. Надворнаму радцу Багдановічу было даручана адмераць зямлю.

У архіве знойдзены яшчэ два дакументы: першы – Справа аб хадайніцтве адміністратара Мінскага Кальварыйскага касцёла аб адвядзенні ўчасткаў зямлі для расшырэння могілак, 06.06.1903 – 07.12.1909; (2)

другі – хадайніцтва адміністратара Кальварыйскага касцёла аб расшырэнні Кальварыйскіх могілак і аб асігнаванні 1000 руб. на рамонт багадзельні, размешчанай пры Кальварыйскіх могілках. 15–га студзеня 1914 г. Дума ў складзе 31 публічнага члена пастанавіла: хадайніцтва адміністратара Кальварыйскага касцёла перадаць на заключэнне і даклад Думе Гарадской будаўнічай камісіі. (3)

Цяпер Кальварыйскія могілкі займаюць тэрыторыю ў 14 гектараў. З 1967 г. могілкі закрытыя для пахаваньня (дазваляецца толькі пахаваць прах). На іх знаходзіцца касцёл. Вядома, што ранейшы касцёл быў драўляны і стаяў на іншым месцы. Калі драўляны касцёл быў пабудаваны – невядома.

---

(1) Дзяржаўны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь, фонд 299. Вопіс 1, адзінка захоўвання 277, лісты 362–395.

(2) Дзяржаўны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь, фонд 220, вопіс 1, адзінка захоўвання 820.

(3) Там жа, фонд 24, вопіс 1, адзінка захоўвання 3639, ліст 673 аб.

У кнізе "Nasze kościoły" (1) указваецца, што ён быў з вялікімі вежамі. У 1800 годзе ў гэты касцёл ксёндз–біскуп Дадэрка перавёў ксяндзоў–францішканцаў. Ёсць упамінанне пра касцёл у інвентары з 1820 г., складзеным 24–га красавіка з прычыны атрымання парафіі ксяндзом Станіславам Бяртовічам. У 1827 годзе былі спробы адрамантаваць касцёл: пакрылі новы дах, аднавілі вежу, але гэтага хапіла ненадоўга. У 1830 г. касцёл быў разабраны.

Архіўныя матэрыялы паведамляюць, што "минский господин Епископ и кавалер Липский отношением от 29 августа за № 1601м 1834 года требовал учинить распоряжение о дозволении построить за городом Минском на кладбище в Кальварии вместо деревянного ветхого каменный костёл за пожертвованные помещиком Игуменского уезда *Павликовским* 5000 руб. серебром; почему Губернское правление на основании правительствующего Сената в Минскую грекороссийскую и Литовскую грекоуниатскую Духовные консистории от 28 ноября 1834 г. отнеслось требованием, дабы благоволила уведомить Сее правление для дальнейшего постановления, не находят ли оныя препятствия на постройку означенного каменного костёла за Минском в Кальварии на кладбище вместо такового же деревянного обветшалого, о чём уведомлено отношением и Епископа Минской Епархии, вследствие чего Литовская грекоуниатская и Минская грекороссийская Духовные консистории уведомили первые, что к постройке за городом Минском в Кальварии вместо деревянного каменного костёла препятствий не имеется."(2)

Касцёл, пабудаваны ў 1839 – 1841 г.г., з'яўляецца помнікам неагатычнага стылю. Мураваны, аднанефавы з невялікім трансептам і прамавугольнай алтарнай апсідай, храм накрыты высокім двухсхільным дахам. Галоўны ўваход выражаны ў выглядзе вялікага стральчатага партала. Над прытворам узвышаецца масіўная, квадратная ў плане вежа, падзеленая на дзве часткі карнізам з сухарыкамі. У верхняй яе частцы два вузкія стрэльчатыя акны, над якімі круглая люкарна. Сцены галоўнага і бакавых фасадаў дэкараваны аркатурнымі паясамі, прарэзаны стрэльчатымі вокнамі, аздоблены ліштвамі. Унутраная прастора перакрыта цыліндрычнымі скляпеннямі з распалубкамі на падпружных арках, якія апіраюцца на квадратныя ў сячэнні слупы.(3)

---

(1) Nasze kościoły, т.II, Warszawa – Petersburg, 1913, стар. 177 –178.

(2) Дзяржаўны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь, фонд 299, вопіс 1, адзінка захоўвання 269, лісты 998 – 1002.

(3) Архітэктура Беларусі. Мн., 1993, с. 330.

У 1899 годзе касцёл быў адрамантаваны. Кальварыйская плябанія, пабудаваная ў 1841 г., адноўлена ў пачатку XX стагоддзя пры пробашчы кс. Зельбе. Касцёл многа перажыў на сваім вяку, два разы яго абкрадалі (1833 і 1866 г.г.).

У 30–я гады XX стагоддзя касцёл быў зачынены. Ён выкарыстоўваўся як склад, а пасля вайны ў ім размяшчаліся майстэрні.

Пасля вайны на працягу 35 гадоў людзі кожны дзень маліліся каля каплічак з правага боку ад касцёла, падавалі прашэнні да ўладаў Мінска і Масквы з просьбай адчыніць касцёл. Нарэшце ў канцы 1980 г. касцёл пачаў дзейнічаць. Кальварыйскі касцёл быў першы, які адчынілі ў Мінску пасля Другой сусветнай вайны. Настаяцелем гэтага касцёла быў прызначаны ксёндз Ян Адамовіч.

На могілкі вы ўваходзіце праз Кальварыйскую браму[1] – помнік архітэктуры эпохі класіцызму. Цаглянае, прамавугольнае ў плане, збудаванне з вялікім цэнтральным і сіметрычна размешчанымі па баках меншымі паўцыркулярнымі праёмамі накрыта пакатым двухсхільным дахам. Падзелена карнізам на два ярусы. Ніжні – руставаны, над бакавымі праёмамі верхняга яруса – ляпная гераль-дыка.

Кальварыйская брама – помнік *Юзэфе Кабылінскай з* роду *Барташэвічаў*, жонцы *Юрыя Кабылінскага*. На помніку напісана, што Юзэфа Кабылінская была пахаваная ў верасні 1830 г. У Метрычнай кнізе не ўдалося знайсці запіс аб смерці Юзэфы Кабылінскай, затое ёсць запіс аб смерці Юрыя Кабылінскага і яго сына ад другой жонкі – *Юліяна*, якія пахаваны таксама на Кальварыі.

*Юры Кабылінскі* [2] – выдатная асоба ў культурным асяроддзі Мінска I пал. XIX стагоддзя. Калежскі асэсар, сябраваў са шматлікімі дзеячамі культуры, у тым ліку і з Вінцэнтам Дуніным–Марцінкевічам. Апошні ўвекавечыў яго ў “Вечарніцах” і “Пінскай шляхце”. Юры Кабылінскі – літаратар–аматар, аўтар рукапіснага зборніка жартаў “Тысяча фацэціяў і адна”, адданы збіральнік твораў мастацтва. З цягам часу яго калекцыя ператварылася ў сапраўдны музей, які гараджане з гонарам паказвалі гасцям Мінска. Нарадзіўся ў 1779 г. Пасля заканчэння Мінскага шляхецкага вучылішча ён ў 1795 г. паступіў на службу ў Мінскі дваранскі дэпутацкі сход, дзе ў 1817 г. атрымаў чын ганаровага радцы. З 1823 па 1835 г.г. займаў пасаду сакратара

---

(1) Архітэктура Беларусі. Мн., 1993, с. 330.

(2) Ул. Дзянісаў. Сядзіба на пляцы Волі. – “Добры вечар”, 17.06.1991 г.

Дваранскага сходу, а пасля 1835 г. служыў чыноўнікам у Мінскай губернскай будаўнічай камісіі. За гады службы быў узнагароджаны ордэнамі Св. Ганны 3–й ступені, Св. Уладзіміра 4–й ступені і Св. Станіслава 3–й ступені.

Ю. Кабылінскі быў вядомы як здольны мастак. Займаўся рэстаўрацыяй старажытных абразоў. Адзін з такіх абразоў Божай Маці пасля аднаўлення ён ахвяраваў Кафедральнаму касцёлу.

У XIX стагоддзі Кальварыя была арыстакратычнымі каталіцкімі могілкамі. Тут знайшлі свой вечны спачын прадстаўнікі шматлікіх знакамітых шляхецкіх родаў. Амаль усе пахаванні XIX стагоддзя – гэта пахаванні арыстакратаў. У кнізе чытач знойдзе іх. Назавём толькі некаторыя. Гэта *Вайніловічы*, *Валіцкія, Ваньковічы, Віткевічы, Дарэўскія–Вярыгі, Горваты, Грыгаровічы, Доўнары, Кабылінскія, Камоцкія, Кярсноўскія, Ланеўскія, Лычкоўскія, Макаровічы, Неслухоўскія, Навіцкія, Паўлікоўскія, Паўлюці, Пішчалы, Храптовічы, Чараповічы, Чачоты, Эйсманты, Янушкевічы* і сотні іншых. Пра некаторыя з іх удалося атрымаць пэўныя звесткі ў архіве ці з надпісаў на помніках.

Захавалася магіла і помнік *Казіміру Ваньковічу* – старшыні Апеляцыйнага (межавага) суда Мінскай губерніі, памешчыка; *Горват Габрыэлі з Ваньковічаў* – жонкі Отана Горвата, які з 1846 па 1853 г.г. быў Мінскім губернатарам.

Род *Вайніловічаў* (на сродкі Эдварда і Алімпіі Вайніловічаў у 1911 г. быў пабудаваны ў Мінску Чырвоны касцёл св. Алены і св. Сымона) прадстаўлены імёнамі мужа і жонкі *Вайніловічаў Антона і Кацярыны, Вайніловіч Анастассі, Барбары, Клацільды* (манашкі–бенедыктынкі), *Хрысціны, Францішкі, Юзэфы, Юліі*.

З роду *Чачотаў*, які даў вядомага беларускага і польскага паэта, фальклрыста Яна Чачота (1796 – 1817), ёсць пахаванні мужа і жонкі *Чачотаў Віктара* (ганаровага радцы) і *Марцыянны, Чачот Валерыі, Канстанцыі, Марыі, Юзэфа* (калежскага асэсара).

Захаваліся ў добрым стане пахаванні *Дарэўскіх–Вярыгаў* (1): *Вінцэнціны, Адольфа* (інжынера камунікацыйных шляхоў, радцы стану), *Аляксандра* (памешчыка, капітана), *Вінцэнта* (межавага суддзі Мінскага павету), *Канстанціна* (доктара медыцыны).

---

(1) Арцём Вярыга–Дарэўскі (1816–1884) – беларускі пісьменнік–дэмакрат. У час паўстання 1863–1864 г.г. – адзін з арганізатараў узброенага выступлення на Віцебшчыне. Аўтар паэмы «Ахульга», драмы «Гордасць», камедый «Хцівасць», «Грэх» і інш.

Тут прадстаўлены шырокі спектр чыноўнікаў таго часу – ганаровых званняў і пасад.

Тайны радца *Лапушынскі Канстанцін.*

Радцы стану: *Дарэўскі–Вярыга Адольф, Дзевалтоўскі Францішак, Магільніцкі Нестар, Сяліцкі Аляксандр, Урбасевіч Людвік.*

Калежскія радцы: *Арцімовіч Феліцыян, Страшынскі Эдмунд.*

Надворныя радцы: *Веракса Юры, Слабневіч Францішак, Цымерман Андрэй, Шышка Ціт, Эйсмант Станіслаў.*

Калежскія асэсары: *Аляшкевіч Антоні, Валынскі Станіслаў, Жаброўскі Рамуальд, Кабылінскі Юры, Камоцкі Ян, Корзан Адам, Кярсноўскі Антоні* (хірург), *Лукашэвіч Антоні, Мацюшэўскі Ян, Мяскоўскі Караль, Чакатоўскі Антоні, Чачот Юзэф.*

Ганаровыя радцы: *Азямбоўскі Міхал, Арлоўскі Ян, Арцімовіч Уладыслаў, Бардскі Мацей* (сакратар Мінскага Дваранскага сходу), *Гутаровіч Ян, Корзан Апалон, Лісоўскі Ануфры* (доктар), *Міхневіч Ігнат, Навіцкі Мікалай, Прага Ян* (мінскі земскі спраўнік), *Рыдзеўскі Ян, Стульчынскі Ігнат, Стэмпкоўскі Аўгустын, Цехановіч Вінцэнт, Чачот Віктар, Юркевіч Казімір.*

Калежскія сакратары: *Вільчынскі Юзэф, Вяжбіцкі Юзэф, Жагота Вінцэнт, Коц Рох, Ліхадзяеўскі Караль, Лыжыкевіч Дзяніс, Макоўскі Міхал, Матусевіч Казімір, Пазняк Вінцэнт, Смольскі Стэфан, Стэфановіч Ян, Тумілович Пётр.*

Губернскія сакратары: *Матусевіч Банавентура, Мрачкоўскі Ігнат, Сцяльніцкі Аляксандр.*

Калежскія рэгістратары: *Ражанскі Ян, Сяліцкі Эразм, Узлоўскі Аляксандр.*

Судовыя чыноўнікі: *Ванькович Казімір і Вяжбоўскі Ян* – старшыні Мінскага апеляцыйнага (межавага) суда, *Гайдукевіч Мікалай і Дарэўскі–Вярыга Вінцэнт* – межавыя суддзі, *Грыгаровіч Юзэф* – суддзя Галоўнага суда дэпартаменту Мінскай губерніі, *Набароўскі Мельхіёр* – суддзя павятовага суда.

Вайскоўцы: *Буйвіды Міхал і Юзэф* – палкоўнікі, *Шышка Аляксандр* – палкоўнік Каўказскай артылерыі, *Масальскі Антоні* – адстаўны маёр, *Пазняк Сідар* – капітан Мінскага батальёна ўнутранай варты, *Скірмант Юльян* – капітан штабс–ад'ютант, *Русовіч Тамаш і Хадасевіч Марцін* – адстаўныя унтэр–афіцэры, *Баклеўскі Аляксандр* – штабс–капітан, *Макаровіч Феліцыян* – паручык артылерыйскага палка, *Снітка Феліцыян* – адстаўны паручык корпуса ляснічых, *Аляхновіч Францішак–Аляксандр* – ротны камандзір 120–га Серпухаўскага палка,

*Здраеўскі Генрык* – адстаўны паручык, *Ігнацьеў Юзэф* – гарніст Палтаўскага пяхотнага палка 8-й мушкецёрскай роты, *Шульвінскі Антоні* – жаўнер Мінскага гарнізоннага батальёна, *Ягела Юзэф і Ян* – сыны адстаўнога салдата Людвіка Ягелы.

Настаўнікі: *Венгжыноўскі Ігнат* – настаўнік Мінскага вучылішча, *Грынкевіч Стэфан* – заслужаны настаўнік Мінскай гімназіі, *Даль Песцэ Бернард* – прыватны настаўнік італьянскай мовы і літаратуры, *Кавальніцкая Алена* – кіраўнік прыватнай жаночай сярэдняй школы ў Слуцку, *Кострa Міхал* – адстаўны настаўнік, *Монтэграндзі Луіс* – выкладчык французскай мовы Мінскай мужчынскай гімназіі, *Слабневіч Францішак* – прэфект Мінскай гімназіі, ганаровы радца, *Страшынскі Эдмунд* – інспектар Мінскай гімназіі, калежскі радца.

Медыкі: *Лагода-Вярэнька Францішак, Дарэўскі-Вярыга Канстанцін, Мяскоўскі Караль, Сільвястровіч Фелікс* – дактары, *Кярсноўскі Антоні* – *хірург*, *Віткоўскі Валенцій* – *аптэкар*.

Інжынеры: *Дарэўскі-Вярыга Адольф* – інжынер камунікацыйных шляхоў, *Гадачэўскі Люцыян* – інжынер Тыфліскай інжынернай каманды, падпаручык.

*Леапольд Дэльпацэ* [1]– купец, з 1836 па 1839 г. быў гарадскім галавою Мінска. Яго продкі паходзілі з Англіі або Шатландыі. На свае ўласныя сродкі добраўпарадкаваў пляц Новага Рынку – "... зрыў узгоркі, засыпаў яміны і яры і ўсю паверхню зрабіў роўнай і гладкай – пасадзіў вакол дрэвы."

Пад галоўным алтаром Кальварыйскага касцёла пахаваны астанкі *Яна Дамеля*. *Ян Дамель* – прафесар Віленскага ўніверсітэта, жывапісец, рысавальшчык. З 1822 г. жыў у Мінску. Пакінуў значны след у мастацтве Літвы і Беларусі. Аўтар карцін на гістарычныя, рэлігійныя тэмы, малюнкаў на тэмы народнага побыту, партрэты. Памёр 18(30).08.1840 г. Даведнікі падаюць дату яго нараджэння – 1780 г. Але ў архіве захаваўся запіс аб смерці Яна Дамеля, і ён сведчыць, што Ян Дамель пражыў 50 гадоў, а не 60, значыць ён нарадзіўся ў 1790 годзе.

У кнізе Ул. Сыракомлі мы чытаем: "Кіраўніцтва плябані дало нам ключы ад капліцы, якую мы моўчкі агледзелі. Сама капліца, пабудаваная ў першых гадах бягучага стагоддзя панам Паўлікоўскім, мае за вялікім алтаром велічную фрэску – выяву гары Ерусалімскай

---

[1] Россия. Полное географическое описание нашего отечества. Под ред. В. П. Семёнова. т.9, Верхнее Поднепровье и Белоруссия, 1905, ст. 418.

Ул. Дзянісаў. Сядзіба на пляцу Волі. – "Добры вечар," 17.06.1991 г.

Кальварыі, жалобнай крыжовай Галгофы. У цэнтры гэтай фрэскі вялікі, у пазалочанай раме абраз Хрыста, які лічыцца адным з найлепшых твораў Дамеля. Пад гэтымі сімваламі пакутаў і смерці, пад заслонаю тварэння ўласнага пэндзля, пад вялікім алтаром спачываюць астанкі самога Дамеля. Ані ў капліцы, ані ў надворнай яе сцяне няма грабніцы мастака: маўзалеем яму служыць уласны твор." [1]

Недалёка ад касцёла, злева ўздоўж нешырокай алеі, пахавана сям'я *Неслухоўскіх.*

*Янка Лучына* (Ян Люцыянавіч Неслухоўскі) – вядомы беларускі паэт–дэмакрат XIX стагоддзя. Нарадзіўся 06.07.1851 г. у Мінску ў сям'і юрыста. Вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце, скончыў Пецярбургскі тэхналагічны інстытут. Пісаў на беларускай, польскай і рускай мовах. У 1898 г. выйшаў першы зборнік Янкі Лучыны "Паэзія" (на польскай мове), у 1903 г. – на беларускай мове зборнік "Вязанка". Яго творчасць прасякнута любоўю да роднай зямлі, народа. Збіраў беларускі фальклор, запісы дасылаў П.В.Шэйну. Перакладаў на польскую мову з рускай, нямецкай, старажытнагрэчаскай. У 1988 г. у Мінску выйшаў зборнік Янкі Лучыны "Творы. Вершы, нарысы, пераклады, лісты."

Помнік на магіле *Янкі Лучыны* не захаваўся, цяпер там ляжыць невялічкая гранітная пліта. Побач – магілы яго родных: бацькі – *Неслухоўскага Люцыяна* (калежскага сакратара, сакратара Грамадзянскай палаты ), *Неслухоўскіх Антонія і Антаніны Трэпкі* (з роду Неслухоўскіх). Ёсць безыменная магіла. Кажуць, што гэта магіла маці Янкі Лучыны – Антаніны. У метрычных кнігах захаваліся запісы аб пахаванні на Кальварыі сястры Янкі Лучыны *Кацярыны Неслухоўскай*, яго братоў *Багдана і Юрыя*. Але іх магілы не знойдзены.

На цэнтральнай алеі пахаваны *Ян–Баляслаў Луцкевіч*, сын Акіма [2] – бацька вядомых дзеячаў Беларускага Адраджэння Івана і Антона Луцкевічаў. Ён нарадзіўся 15 мая 1831 г. ў сям'і старадаўняга збяднелага беларускага шляхецкага роду герба "Навіна", сваёй уласнай зямлі не меў. У час Крымскай вайны 1854– 56 г.г. удзельнічаў у абароне Севастопаля ў чыне штабс–капітана рускай арміі. Вытрымаў 349–дзённую абарону, быў паранены. Вярнуўся дамоў з баявымі

---

[1] Ул. Сыракомля. Мінск. Беглы агляд сучаснага стану Мінска, Мн. 1922. с. 24–25.

[2] Г. Каханоўскі. Бацька Івана і Антона. – ЛіМ, 1990, No 44, с. 16.

М. Іваноў , Л. Мірачыцкі. Асветнік, папулярызатар, збіральнік. – Голас Радзімы, 1981, № 24, с. 4.

А. Сідаровіч. Паходня. – Добры вечар, 15.05.1991,с. 3.

ўзнагародамі. На Бацькаўшчыне ён улавіў першыя зрухі ў грамадскім жыцці. Выспявалі перадумовы паўстання 1863–1864 г.г. Пранікаўся новымі ідэямі і былы афіцэр. У самым пачатку народнай плыні Ян Луцкевіч быў у шэрагах паўстанцаў, адважна ішоў з імі ў атаку.

Пад Мінскам паўстанцкі атрад сутыкнуўся з рэгулярнымі царскімі войскамі. Што здарылася пазней з Я. Луцкевічам, гісторыя маўчыць. Не выключана, што ён трапіў у царскую няміласць, магчыма быў на высылцы.

Як знік ён нечаканна, так і з'явіўся зусім нечаканна.

Пад Бабруйскам у Тарасевічах на гадавое свята Спаса збіраўся народ. Трапіў на той фэст і Ян Луцкевіч, які арандаваў зямлю у Тарасевічах. Гаспадар маёнтка Ксаверы Вайніловіч прымаў і шаноўнага госця – Вінцэнта Дуніна–Марцінкевіча. З нагоды гэтай сустрэчы паэт напісаў верш «Заўтра Спаса, кажуць людзе». І дата стаіць 5–га жніўня 1868 г. У вершы ён раіць Луцкевічу: «Кінь жыццё бурлацкае, а пашукай жонкі маладой, прыгожай, любячай цябе, каб усе зайздросцілі і глыталі слінкі». Спачатку верш быў апублікаваны ў 1902 годзе ў «Минском листке», а затым у 1924 г. у Вільні ў зборніку «Заходняя Беларусь». Пасля пародыі Дуніна–Марцінкевіча Луцкевіч ажаніўся з Зосяй Лычкоўскай. Ён стаў часта бываць на Маладзечаншчыне, дзе жыла сям'я Лычкоўскіх. Пайшлі дзеці Іван, Антон, Эмілія, Сцяпан. Апошні названы ў памяць пра дзядзьку Сцяпана, які таксама быў паўстанцам і загінуў у 1863 годзе. Ян, сын Якіма, стаў адным з першых беларускіх чыгуначнікаў. Службовыя абавязкі завялі яго сям'ю ў Лібаву, Шаўлі. У 1895 годзе ён пайшоў у адстаўкі і сям'я перабралася ў Мінск. Пасяліліся на вуліцы Крашчэнскай, 27 (або Пясчанскай), на беразе Свіслачы. Пазней гэтая вуліца атрымала назву Садовая. У 1920–30–х гадах тут таксама стаяў дом Янкі Купалы.

Ян–Баляслаў Якімавіч Луцкевіч памёр 4–га верасня 1895 г. у Мінску. На магіле захаваўся помнік з чорнага граніту. Побач пахаваная *Плявака Марыя з Луцкевічаў*. На жаль, мы не змаглі вызначыць, кім яна даводзілася Яну–Баляславу Луцкевічу.

Злева ад касцёла, у агароджы, стаіць драўляны крыж. Гэта магіла *Вацлава Іваноўскага* – вучонага, грамадскага і палітычнага дзеяча, які поплеч з братамі Луцкевічамі стаяў ля вытокаў Беларускага Адраджэння. Нарадзіўся ў 1880 г. на Лідчыне ў сям'і мясцовай шляхты. Скончыў Пецярбургскі тэхналагічны інстытут (1904 г.), доктар тэхнічных навук, быў прафесарам Варшаўскай Палітэхнікі і Віленскага універсітэта. Ён з'яўляўся ініцыятарам стварэння Беларускай

рэвалюцыйнай партыі (1902 г.) – папярэдніцы Беларускай рэвалюцыйнай грамады (1903 г.) і Беларускай сацыялістычнай грамады (1905 г.). Выдаўца падпольнай беларускай газеты "Свабода". Актыўна супрацоўнічаў у газеце "Наша Ніва", аўтар папулярных артыкулаў і брашур, а таксама першага беларускага універсітэцкага курсу хіміі. У лістападзе 1941 г. В.Іваноўскі становіцца бурмістрам Мінска. 6–га снежня 1943 г. быў цяжка паранены і назаўтра памёр. Вось успаміны маёй цёткі Алены пра забойства і пахаванне В.Іваноўскага.

«Вацлаў Іваноўскі ехаў на брычцы. У самым пачатку вуліцы Астроўскага, каля Кацярынінскай царквы, вылецелі з двара партызаны. Кінуліся на яго, выцягнулі наган і наганам збілі яго да паўсмерці. Я сама гэта не бачыла, але так гаварылі людзі. Памёр Іваноўскі праз некалькі гадзін у шпіталі. Ксёндз Зянон Ігнатовіч (служыў у Чырвоным касцёле) застаў яго яшчэ жывога і зрабіў яму апошняе намашчэнне. Немцы загадалі ксяндзу Ігнатовічу хаваць В. Іваноўскага. Але той адмовіўся, сказаў, што Іваноўскі не каталік, і таму патрэбны спецыяльны дазвол віленскага біскупа. Намеснік біскупа сабраўся ехаць у Мінск, але чыгуначныя пуці былі разабраны, і ён з паўдарогі вярнуўся. Хавалі В. Іваноўскага праваслаўныя святары. На яго магіле быў пастаўлены драўляны крыж з надпісам па–беларуску. Хутка пасля 3–га ліпеня 1944 г. надпіс знік, а крыж стаяў яшчэ доўга, гадоў пятнаццаць». (1) 9–га снежня 1990 г. да 110–годдзя з дня нараджэння Вацлава Іваноўскага на яго магіле зноў пастаўлены дубовы крыж.

На Кальварыйскіх могілках захаваліся магілы мінскіх святароў: *Аўгустына Валентовіча* – магістра тэалогіі, *Юзэфа Ваявоцкага* – пробашча Мінскай катэдры ў 1886–87 г.г., *Яна Віткевіча* – мінскага біскупа, *Клеманса Дабкевіча* – пробашча Мінскай катэдры ў 1874 г., *Дамініка Каўчэвіча*, *Мацвея Ліпскага* – мінскага біскупа, *Людвіка Лыжыкевіча* – прэлата Мінскай катэдры, члена Капітулы, *Людвіка Пляскоўскага*, *Паўла Равы* – намінат–біскупа, *Аляксандра Сіпайлы, Чэслава Снарскага – пробашча Чырвонага касцёла, Людвіка Тэлічана.*

Пахаваны ў Кальварыі і святары *Бенедыкт Ачапоўскі, Ян Бжазоўскі* – прэлат Мінскай Катэдры, *Юліян Івашкевіч* – адміністратар Волчкавіцкай філіі, *Юзэф Каверскі* – капелан, *Францішак Навіцкі* – прэлат, пробашч Мінскай парафіі, настаўнік Закону Божага ў Мінскай гімназіі, *Станіслаў Рудніцкі* – капелан таварыства Дома дабрачыннасці, *Віктар Свяжбінскі* – століаначальнік Мінскай рымска–

(1) Вацлаў Іваноўскі. Да 110–годдзя, Мн., 1990, стар. 47–48.

каталіцкай духоўнай кансісторыі, *Фларыян Шымкевіч* – ксёндз канонік Мінскай катэдры, *Алаіз Шышнеўскі* – прэлат Мінскай катэдры, *Яцына Х.* – вікары Мінскай катэдры.

Але магілы, помнікі гэтых святароў не захаваліся. Іх імёны знойдзены ў касцельных запісах аб смерці.

У Кальварыі знайшлі свой апошні спакой душы братоў і сясцёр законных. Тут пахаваныя манахі Бернардынскага Ордэна: *Мацей Акрасенскі* (ксёндз), *Гумільян Гутаровіч, Арнульф Еўтутовіч* (ксёндз), *Якуб Жабіцкі* (ксёндз), настаяцелі кляштара бернардынаў *Юльян Мачулеўскі* і *Мар'ян Міцкевіч* (ксёндз), *Стэфан Пяняўскі* – прапаведнік, ксёндз, *Мадэст Рамашкевіч, Юліян Самарок* – настаўнік рускай мовы, *Фартунат Чарняўскі* – іераманах, *Пётр Цэлестын Шацімір*; манашкі Бенедыктынскага Ордэна: *Бенедыкта Бароўская, Клацільда Вайніловіч* – ігуменння кляштара бенедыктынак, *Даміініка Зажэцкая, Ганна* і *Гертруда Кімбар, Яўхімія Кудзіновіч, Канстанцыя Пазняк*, *Харытона Рымша*, *Кацярына Свентажэцкая, Ядвіга Тамашэўская, Фаустына Яналовіч*; манашкі Дамініканскага Ордэна: *Ружа Казлянінаф*, *Казіміра Нядзведская*; манашкі Базыльянскага Ордэна: *Антаніна Ляснеўская, Дзяметрыя Хрыстоўская*; манашка Мінскага дабрачыннага таварыства *Караліна Сянкевіч*.

Безумоўна, гэта далёка не поўны спіс тых прадстаўнікоў духавенства, закону, якія пахаваны ў Кальварыі. У часы панавання атэізму разбураліся не толькі святыні. Знішчаліся магілы, калечыліся помнікі, касцельныя кнігі з рэгістрацыяй аб нараджэнні і смерці, шлюбе.

З вышэй прыведзенага спісу пахаваных у Кальварыі манахаў і манашак захаваліся толькі магілы *Клацільды Вайніловіч, Якуба Жабіцкага і Ружы Казлянінаф*.

Біскуп *Мацвей Ліпскі* пахаваны пад алтаром з правага боку ад уваходу. Там стаяў помнік і быў адпаведны надпіс. Захаваўся толькі надпіс на вонкавым баку касцельнай сцяны.

Мацвей Ліпскі (1) – былы базыльянін, маючы званне арцыдыякана беларускага, быў памочнікам першага мінскага біскупа Якуба Дадэркі. Якуб Дадэрка ў 1798 г. быў высвечаны ў Полацку і хутка пасля гэтага ўрачыста ўвайшоў у Мінскую катэдру. У 1812 г. ён удзельнічаў у патрыятычных акцыях супраць царызму, чым выклікаў няміласць у цара Аляксандра I і ў 1816 г. быў вымушаны пакінуць Мінск.

(1) Jelski Aleksander.Dzieje Dyecezyi Mińskiej w zaryse. Mińsk, 1907, ст.7.

У час адсутнасці Якуба Дадэркі на біскупскім троне Мінскай дыяцэзіяй кіравалі: ад 1816 да 1824 г. прэлат мінскі Стэфан Пазняк; ад 1824 да 1827 прэлат Юзэф Камінскі, а пасля яго (пасля смерці Дадэркі ў 1829 г. у Альце) Мацвей Ліпскі, ужо як біскуп аўрэпалітанскі. Яшчэ перад смерцю Дадэркі прэтэндаваў на Мінскае біскупства былы езуіт, прэлат мінскі і пробашч гістарычнай Слуцкай Фары (з.1419 г.) Станіслаў Шантыр, але арцыбіскуп Сестшанцэвіч быў супраць гэтага. Ён прызначыў на гэтую пасаду Мацвея Ліпскага. Урачыстае абвяшчэнне папскага прызначэння біскупам Мацвея Ліпскага адбылося толькі 25 лютага 1831 г., г. зн. праз шэсць гадоў пасля смерці Сестшанцэвіча († 1825).

Мацвей Ліпскі выконваў свае пастырскія абавязкі ў смутны час разбурэння касцёлаў і кляштараў на Беларусі.

Пасля Мацвея Ліпскага ў 1839 г. прызначэнне на гэтую пасаду атрымаў ад урада мінскі прэлат *Павел Рава* (1) – чалавек пасіўны, які нічым не вылучаўся, persona grata для ўлады. Але Апостальская сталіца не пацвердзіла гэтае прызначэнне. За час яго адміністрацыі ў 1842 г. адбыліся змены ў тэрытарыяльным падзеле дыяцэзій у Беларусі. Рава кіраваў дыяцэзіяй да 1853 г. Пасля гэтага ён жыў у Мінску і памёр тут 25 студзеня 1859 г. ва ўзросце 90 гадоў.

Павел Рава пахаваны на Кальварыйскіх могілках. Захавалася яго капліца. Ігнат Легатовіч увекавечыў Раву такой эпітафіяй, дакладней эпіграмай:

«Tu leży ciało, które niegdyś w katadrze siedziało.
Na czem więc róznica zalezy?
Na tem, że pierwiej siedziało,
A teraz leży»...
( Тут ляжыць цела, якое калісьці ў катэдры сядзела.
У чым, аднак, ёсць розніца?
На тым, што раней яно сядзела,
А цяпер ляжыць...)

---

(1) Jelski Aleksander..., ст.7.

Каля левай сцяны касцёла ў 1886 г. быў пахаваны ксёндз *Аляксандр Сіпайла*.[1] Гэта была найцудоўнейшая асоба цяжкага для касцёла і Беларусі часу. Аляксандр Сіпайла нарадзіўся ў 1854 годзе. Сын багатых бацькоў, ён адмовіўся ад кар'еры і выгодаў жыцця і пайшоў за голасам Божым, які клікаў яго стаць жаўнерам войска Хрыста. Яго бацька – інжынер на ўрадавай службе – марыў, што сын пойдзе па яго дарозе. Бачачы цяжкае становішча святароў, ён змагаўся колькі было моцы супраць намераў сына прысвяціць жыццё святарству.

Маладое сэрца Аляксандра рвалася ў семінарыю, але, паважаючы волю бацькі, ён скончыў рэальную школу ў Пецярбургу, затым паступіў у Акадэмію дарог і шляхоў зносін, а ў 1876 г., скончыўшы Акадэмію і пераламаўшы супраціўленне бацькоў, паступае ў Духоўную акадэмію, у 1882 г. становіцца святаром, атрымаўшы ступень магістра святой тэалогіі. Яго першая пасада – капелан у навуковых установах у Віцебску. Аляксандр старанна выконваў пастырскія абавязкі і працу над адраджэннем здэмаралізаванай моладзі. Пасля году пакуты ў Аглоне (кляштары ў Віцебскай губерніі, высылка куды для святароў была карай) духоўная ўлада прызначае яго напачатку вікарыем у Мінску, а потым пробашчам.

Усё жыццё ён прысвяціў сваёй пастве. Ён меў універсітэцкую адукацыю і адначасова быў "чалавекам Божым" у поўным сэнсе гэтага слова.[2] Пра яго можна сказаць тое ж, што было сказана пра святога Станіслава Костку: «За кароткае жыццё ён пражыў доўгія гады». Хіба гэта не цуд, што, калі многія святары ішлі ў Сібір, Аляксандр Сіпайла заняў высокае становішча пры дэкане Макарэвічу, які меў рэпутацыю нядобрага чалавека. Але асоба ксяндза А.Сіпайлы, яго святасць так уздзейнічалі на Макарэвіча, што ён даў А. Сіпайлу магчымасць свабодна працаваць і не праследаваў яго. Вельмі варожа адносіўся да Аляксандра і ксёндз Сенчыкоўскі – вядомы русіфікатар каталіцкага касцёла. Ён пільным вокам сачыў за яго працай. Інтрыгі кс. Сенчыкоўскага павінны былі скончыцца для кс. Сіпайлы новай высылкай, ужо быў нават падрыхтаваны прысуд. Але ён не быў выкананы. Аляксандр Сіпайла памёр у 1886 годзе ад сухотаў, не вытрымаўшы цяжкай працы. Ксяндза вельмі любілі ў горадзе. Тысячы людзей, у тым ліку і іншаверцаў, прыйшлі, каб занесці на сваіх плячах на Кальварыю труну з целам святара.

---

(1) Nasze kościoły, т.II, Warszawa – Petersburg, 1913, ст. 168–169.

(2) Jelski Aleksander ...ст.16.

Людзі ўшаноўвалі кс. Аляксандра як святога. Яны ішлі, каб аддаць пашану незвычайнаму чалавеку. Парафіяне прыносілі дзяцей, каб тыя ўбачылі ў апошні раз Божага апостала. Людзі плакалі, не аднаго самлелага трэба было выносіць з касцёла. Шматтысячная працэсія запоўніла вуліцу, магіла была засыпана свечкамі – знак таго, што разам са смерцю такога чалавека згасла Божае святло ў Мінску. У памяць пра яго самаахвярную працу людзі паставілі помнік з надпісам: «Святога жыцця не многа дзён, а добрая слава жыць будзе вечна». («Świętego żywota nie wiele dni, a dobra sława trwać będzie na wieki»).

Час, войны захавалі помнік, які паставілі ўдзячныя вернікі на магіле любімага пастыра. Але не шукай, шаноўны чытач, гэты помнік на магіле Аляксандра Сіпайлы пры левай сцяне касцёла, яго там няма, і магілы няма. У сярэдзіне 80–х гадоў, у наш час, вернікі Кальварыйскага касцёла магілу зруйнавалі, месца залілі асфальтам, а помнік з барэльефам перасунулі на метраў 10 улева і паставілі сярод чужых магіл. Чым растлумачыць гэты акт вандалізму? Аказваецца, магіла кс. Аляксандра Сіпайлы перашкаджала працэсіі вернікаў. Хочацца сказаць: “Божа, даруй ім.”

Такі ж лёс напаткаў і магілу кс. *Чэслава Снарскага,* якая была побач з магілай А. Сіпайлы. Яго крыж стаіць на чужой магіле. Чэслаў Снарскі быў пробашчам Чырвонага касцёла св. Сымона і св. Алены ў 20–х гг. XX стагоддзя. Памёр ад тыфу, якім заразіўся ад хворага на споведзі.

Пасля смерці А. Сіпайлы Мінск атрымаў дастойнага пастыра ў асобе ксяндза Малецкага.

Затым пасаду займае ксёндз *Юзэф Ваяводскі*, але таксама не доўга, бо і яго напаткаў лёс папярэдніка – прымусовае пасяленне ў Аглоне. Праз год яму было дазволена вярнуцца ў Мінск, але без права выканання святарскіх функцый. Праўда, некалькі разоў яму прапаноўвалі парафію, але з умовай адпраўлення набажэнства па–руску. Ксёндз Ваяводскі не згадзіўся на гэта. Пасля ксяндза Малецкага ён кіраваў парафіяй, але нядоўга, бо ўжо 8–га мая 1887 года памёр ва ўзросце 45 гадоў. (1)

---

(1) Nasze Kościoły, т.II, Warszawa – Petersburg, 1913, ст. 169.

# МОЙ РОД

На Кальварыі пахаваны мае родныя – блізкія і далёкія. Пахаванняў блізкіх – 21, як па бацьку, так і маці. Мой дзед па маці *Казімір Антонавіч Гінц* нарадзіўся ў Дзеркаўшчыне (цяпер Глыбоцкі раён). Захавалася выпіска з метрычнай касцельнай кнігі:



